Источник: "Краязнаўчая газета" - 2021-09-16

*Будзем памятаць мы...*

# Даследчык глыбіняў нашай мовы



9 верасня споўнілася 85 гадоў з дня нараджэння беларускага мовазнаўцы Арнольда Яфімавіча Міхневіча. Навуковец скончыў Гомельскі педагагічны інстытут у 1958 годзе. З 1961-га працаваў у Інстытуце мовазнаўства АН БССР. У 1977 годзе – доктар філалагічных навук, у 1980-м – прафесар. З 1983 года працаваў у Інстытуце паліталогіі і сацыяльнага кіравання, з 1991-га – прарэктар і загадчык кафедры Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта, з 1995 года – у Беларускім інстытуце праблемаў культуры (з 1998 года – рэктар), з 2000-га адначасова загадваў кафедрай сучаснай беларускай мовы на філалагічным факультэце БДУ.

Даследаваў пытанні граматыкі, лексікалогіі, этымалогіі беларускай мовы, культуры беларускай і рускай моваў, супастаўляльнай і сацыяльнай граматыкі, рыторыкі і культуралогіі.

Навуковая грамадскасць ведае яго працы «Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове (1965), «З гісторыі прамоўніцкага мастацтва» (1972), «У глыб слова чалавечага» (1982), «Мова, якой няма» (1988) і інш.

З'яўляўся суаўтарам «Слоўніка славянскай лінгвістычнай тэрміналогіі» (тамы 1 – 2, 1977 – 1979 гг.), «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы» (1980), «Беларуска-рускага паралексічнага слоўніка-даведніка» (1985), «Англа-беларускага размоўніка» (1992), кніг «Грамадазнаўства – мова палітыка» (1988), «Беларуская мова для тых, хто гаворыць па-руску» (1990), «Культура мовы ў пытаннях і адказах» (1996), «Беларуская мова: Энцыклапедыя» (1994). За апошнюю працу атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі ў 1998 годзе.

А. Міхневіч памёр у Кёльне (Германія) у 2020 годзе.

Ганаруся сваім знаёмствам з Арнольдам Яфімавічам. Я працаваў у Беларускім інстытуце праблемаў культуры ў 1998 – 1999 гадах, калі ён узначальваў установу. Гэта быў вельмі тактоўны, добрасумленны і адукаваны кіраўнік.

*Аляксей ШАЛАХОЎСКІ*

Аляксей Шалахоўскі. Даследчык глыбіняў нашай мовы